*Трэці працоўны*

# МЕДЫКІ — У СТУДАТРАД

**Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ упершыню рэалізуе ў Беларусі медыцынскі працоўны праект.**

Па словах другога сакратара Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандра Прохарава, медыцынскі профіль студэнцкіх атрадаў актыўна развіваецца: «Мы бачым, як выраслі не толькі лічбы па выніках мінулага года, але і ўцягнутасць студэнтаў у работу студатрадаў гэтага профілю. Ужо апрабаваны ўдзел беларускіх медатрадаў у Расійскай Федэрацыі. Гэтай вясной мы правялі першы злёт медыцынскіх студэнцкіх атрадаў. А самае галоўнае, што ўсё больш медыцынскіх устаноў бачаць у байцах беларускіх студэнцкіх атрадаў медыцынскага профілю надзейных партнёраў».

Першы студатрадаўскі праект з удзелам каля 60 студэнтаў і навучэнцаў профільных медыцынскіх устаноў адукацыі з усёй Беларусі будзе рэалізаваны ў Наваполацку — маладзёжнай сталіцы нашай краіны і ў гістарычным Полацку: на базе Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы, Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы і Полацкай абласной псіхіятрычнай бальніцы, дзе маладыя людзі будуць працаваць у якасці малодшага і сярэдняга медыцынскага персаналу і развіваць свае прафесійныя навыкі.

Гэта стала магчыма дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву з Міністэрствам аховы здароўя, а таксама Наваполацкім гарвыканкамам, Полацкім райвыканкамам і дзяржаўнай падтрымцы студатрадаўскага руху. Плануецца, што праект стартуе 6 ліпеня і працягнецца да канца жніўня. Студэнцкія медыцынскія атрады для ўдзелу ў ім будуць сфарміраваны на конкурснай аснове. На працягу месяца ахвотныя юнакі і дзяўчаты змогуць падаваць свае заяўкі ў Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Лакацыі актыўнасці*

# «НАРАЧАНСКІ» КЛІЧА: ПА СЁДЛАХ!

**У апошнія гады велатурызм набірае папулярнасць, бо веласіпед з'яўляецца адным з самых экалагічных і карысных для здароўя відаў транспарту. Маршруты для веласіпедыстаў па парку «Нарачанскі» распрацавала студэнтка БДУ.**



Актуальнасць работы трэцякурсніцы факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Яўгеніі Гурыновіч заключаецца ў недастатковай на сёння колькасці распрацаваных веласіпедных маршрутаў у асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях Беларусі. Мяркуецца, што новыя прапановы будуць садзейнічаць прыцягненню турыстаў у Нацыянальны парк «Нарачанскі», а таксама становуча паўплываюць на папулярызацыю велатурызму ў рэгіёне і краіне ў цэлым.

Распрацоўка Яўгеніі — гэта пяць веламаршрутаў кальцавога тыпу розных узроўняў складанасці. Тры з іх бяруць свой пачатак ад курортнага пасёлка Нарач, яшчэ два — ад Мядзела. Іх даўжыня вагаецца ад 20 да 65 кіламетраў. Падчас складання маршрутаў улічваліся вышыня, ухіл, тып дарожнага пакрыцця, колькасць помнікаў прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння і колькасць населеных пунктаў, праз якія пралягае шлях. Веламаршруты пракладзены па розных тыпах дарог з улікам умоў надвор'я і падрыхтаванасці турыстаў.

Акрамя гэтага, Яўгенія Гурыновіч звяртае ўвагу ў сваёй рабоце на ландшафтную разнастайнасць мясцовасці. Напрыклад, адзін з маршрутаў праходзіць па ахоўных, рэкрэацыйных, гаспадарчых зонах і перасякае тры тыпы лясоў. Па кожным напрамку складзена кароткае апісанне і графічнае прадстаўленне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Агульны інтарэс*

# ШЭРАГІ ЧЫГУНАЧНІКАЎ ПАПОЎНІЦЬ МОЛАДЗЬ

**Сёлета на Беларускую чыгунку будуць накіраваны каля 200 выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту з вышэйшай адукацыяй і больш за 400 выпускнікоў яго філіялаў — з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.**

Больш за 540 маладых спецыялістаў пачнуць працоўную дзейнасць у аддзяленнях беларускай магістралі, 75 — у іншых арганізацыях, такіх як дзяржаўнае прадпрыемства «БТЛЦ», дзяржаўнае прадпрыемства «Рампуць Беларускай чыгункі», Канструктарска-тэхнічны цэнтр Беларускай чыгункі, дзяржаўнае прадпрыемства «Інстытут» «Белчыгункапраект», РУП «Галоўны разліковы інфармацыйны цэнтр» і інш.

145 выпускнікоў прыйдуць на першыя працоўныя месцы ў адну з самых інавацыйных гаспадарак Беларускай чыгункі — службу сігналізацыі і сувязі, 106 хлопцаў і дзяўчат рэалізуюць свой патэнцыял у гаспадарцы пуці, 98 маладых спецыялістаў будуць забяспечваць працэс перавозак на беларускай магістралі, 75 — папоўняць рады работнікаў лакаматыўнай гаспадаркі, 62 — забяспечаць бесперабойную работу гаспадаркі электрыфікацыі і электразабеспячэння, 96 выпускнікоў будуць працаваць у вагоннай і грузавой гаспадарках БЧ. Акрамя гэтага, у калектыў Беларускай чыгункі прыйдуць каля 30 маладых спецыялістаў у галіне эканомікі і бухгалтарскага ўліку, бізнес-аналітыкі, будаўніцтва і архітэктуры.



Фота з сайта БЧ.

Цяпер на Беларускай чыгунцы працуюць работнікі больш як 300 прафесій і спецыяльнасцяў. Амаль 20 працэнтаў з іх на магістралі — моладзь ва ўзросце да 31 года. Штогод яе рады папаўняюць больш за тысячу маладых спецыялістаў і рабочых.

Размеркаванне студэнтаў — выпускнікоў 2023 года — адбылося напачатку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, затым былі размеркаваны навучэнцы Брэсцкага, Гомельскага і Аршанскага каледжаў — філіялаў БелДУТа. У рабоце камісій па размеркаванні актыўны ўдзел прынялі кіраўніцтва і спецыялісты Беларускай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*На адной хвалі*

# ЗВЯРТАЙЦЕСЯ, ВАС ПАЧУЮЦЬ!

**ЦК БРСМ абнавіў графік прыёму грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.**

Падчас асабістага прыёму маладыя людзі могуць асабіста звярнуцца да кіраўніцтва арганізацыі, задаць хвалюючыя пытанні сакратарам ЦК і старшыні Цэнтральнай кантрольнай камісіі, выказаць свае прапановы і самае галоўнае — атрымаць кансультацыі і тлумачэнні. Такія сустрэчы даюць магчымасць больш глыбока зразумець цяперашнюю абстаноўку і ацаніць эфектыўнасць работы Саюза моладзі.

Асабістыя прыёмы грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб кіраўнікамі ЦК БРСМ праходзяць у Рэспубліканскім доме моладзі па папярэднім запісе па тэлефоне +375 17 371 04 64.

**Графік прыёму сакратароў ЦК БРСМ:**

Аляксандр Лук'янаў, першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ: дзень прыёму — кожная серада месяца з 14.00 да 16.00;

Аляксандр Прохараў, другі сакратар ЦК БРСМ: дзень прыёму — кожны панядзелак месяца з 10.00 да 12.00;

Аляксандра Ганчарова, сакратар ЦК БРСМ, старшыня Цэнтральнага савета БРПА: дзень прыёму — кожны чацвер месяца з 11.00 да 13.00;

Вераніка Гудкова, сакратар ЦК БРСМ: дзень прыёму — кожны чацвер месяца з 14.00 да 16.00;

Павел Алекса, сакратар ЦК БРСМ: дзень прыёму — кожная пятніца месяца з 11.00 да 13.00;

Марына Кашкур, старшыня Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ: дзень прыёму — кожны аўторак месяца з 10.00 да 12.00.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Новыя старты*

# Пачынаецца сезон «Чыстых гульняў»

## Гэта новая форма работы з экаваланцёрамі

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і міжрэгіянальная грамадская арганізацыя экалагічнай і патрыятычнай асветы «Чыстыя гульні» (Расійская Федэрацыя) плануюць арганізаваць на тэрыторыі нашай краіны для каардынатараў валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» серыю майстар-класаў па правядзенні экаквэстаў.**



Такое рашэнне было прынята падчас з'езда «Еўразійская кубка чысціні», які адбыўся нядаўна ў Санкт-Пецярбургу з удзелам маладзёжных дэлегацый Расіі, Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана і Узбекістана.

У час з'езда для ўдзельнікаў дзесяці маладзёжных дэлегацый фактычна адбылася стажыроўка па правядзенні экалагічнага і адукацыйнага праекта «Чыстыя гульні», які дазваляе ў цікавай і спаборніцкай форме ўнесці свой уклад у ачышчэнне навакольнага асяроддзя і асвоіць асновы раздзельнага збору смецця. У тэарэтычнай частцы стажыроўкі ўдзельнікі атрымалі метадычны кейс, пачынаючы ад выбару месца, даты і ўзгаднення мерапрыемства, прыцягнення ўдзельнікаў і рэсурсаў для непасрэднага яе правядзення да навучання валанцёраў. Акрамя таго, у практычным модулі члены маладзёжных дэлегацый сталі не толькі добраахвотнікамі і ўдзельнічалі ў добраўпарадкаванні пэўных тэрыторый, але і паспрабавалі сябе ў якасці арганізатараў.

Праект «Чыстыя гульні» дазваляе не толькі акцэнтаваць увагу грамадскасці на пытаннях забруджвання тэрыторый і раздзельнага збору смецця, але і выхоўвае ва ўдзельнікаў свядомае стаўленне да экалагічных паводзін. Ён прыўнясе ў валанцёрскі рух БРСМ новую форму эфектыўнага камандаўтварэння і карыснага вольнага часу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Камертон настрою*

# Вастрыце пёры, калегі

**У Беларусі з'явіўся Рэспубліканскі конкурс маладых журналістаў «Прэс-код». Плануецца, што ён будзе праводзіцца Міністэрствам інфармацыі і БРСМ штогод.**

Па інфармацыі Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала, удзельнічаць у ім могуць маладыя людзі ва ўзросце ад 16 да 31 года, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Яны будуць падзелены на ўзроставыя групы: ад 16 да 21 года ўключна і ад 22 да 31 года ўключна (на момант накіравання заяўкі).

Канкурсанты падаюць заяўку на ўдзел па ўстаноўленай форме і матэрыялы ў адпаведнасці з патрабаваннямі. Інфармацыя аб выніках будзе размяшчацца на афіцыйных сайтах Міністэрства інфармацыі і БРСМ.

Мерапрыемства накіравана на рэалізацыю задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, садзейнічанне прафесійнаму станаўленню маладых журналістаў СМІ, выяўленне талентаў у галіне журналістыкі моладзі; садзейнічанне фарміраванню разважлівай, медыяадукаванай асобы і фарміраванне кадравага рэзерву маладых журналістаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**